Как заявляют представители Минсельхозпрода, сегодня в Беларуси 1 265 миллионов личных подсобных хозяйств, занимающих 1,3 миллиона гектаров, или 15 процентов земельных угодий страны.

По статистике, 54,4 процента белорусских семей на селе употребляют свое молоко и молочные продукты. Картофель, овощи, фрукты и ягоды — все это выращивается на огородах и дачах, а потом частным путем перевозится на рынок. 84,3 процента семей имеют дополнительный доход от личного хозяйства — дач и огородов. Причем социальные льготы в доходной части бюджета семьи составляют 1,6 процента, а доходы от личного подсобного хозяйства и продажи сельскохозяйственной продукции — 24,7. При этом доля зарплаты в доходах немногим больше — 35,7 процента.

Можно понять, насколько упрощает жизнь среднестатистической белорусской семье наличие собственного дачного хозяйства. Подсобные хозяйства для многих семей в районных центрах уже давно стали основным средством пропитания. Но ни министерства, ни бюджетного фонда по развитию дач и огородов в стране нет. Все делается дачниками самостоятельно. Кстати, может быть, именно поэтому эффективность работы их хозяйств остается столь высокой.

ДЕ-ЮРЕ И ДЕ-ФАКТО

Все дачники нашей страны объединены в садоводческие товарищества — самостоятельные, но плохо управляемые структуры. Отсюда беспорядки, царящие во многих садоводческих общинах: нет инженерного обустройства территорий, не налажена служба охраны, участки не обрабатываются, захламляются. Бывает, что и захватываются соседями. Не ремонтируются дороги, отсутствует вода.

Ситуация характерная, и вызвана она устаревшей и недостаточной правовой регламентацией садовых товариществ, зафиксированных в типовом уставе, утвержденном постановлением Совмина БССР аж в 1989 году. Изменения в этот акт вносились в 1992 году. Никакого законодательного регулирования этих общественных отношений на сегодняшний день не существует. Правда, в статье 116 гражданского кодекса есть упоминание о том, что есть такие садоводческие товарищества. Этим кодекс и ограничивается.

Имущественные отношения в садоводческих товариществах и кооперативах тоже никак не урегулированы. В такой ситуации дачникам неинтересно создавать общее имущество: строить детские площадки и другие сооружения, благоустраивать территорию и дороги, приобретать инвентарь для общего пользования. Инфраструктура поддерживается только по крайней необходимости.

А раз нет собственника — нет права требовать. Дачники платят свои взносы как мзду. Кому, непонятно. К тому же расходование этих средств дачниками практически не контролируется.

КАК НЕ УТОНУТЬ В МУСОРЕ

Езжу к родственникам мимо участков и поражаюсь состоянию леса возле дачного поселка. Всюду куски пленки, ржавые ведра, тряпки — горы мусора.

Тема «мусор возле дач» однажды вызвала пристальное внимание белорусского президента. Говорят, еще в 1998 году, пролетая над страной на вертолете, Лукашенко увидел сие безобразие и приказал разобраться главе Минприроды.

С тех пор дачники стали объектом неустанного внимания природоохранных служб, исправно штрафующих всех, кто попадется, на сумму до 50 минимальных зарплат. Но штрафные санкции не помогают.

Природоохранные службы Минского района подсчитали, что товарищества, расположенные на их территории, выдают на гора ежегодно 31 тысячу тонн мусора. А вывозится на свалки только 5 тысяч тонн. Договоры на вывоз мусора заключены лишь у 19 из 334 товариществ района. Власти не могут к этому обязать дачников. А у садовых товариществ не хватает денег на оплату соответствующих служб и покупку контейнеров для мусора. Тем более один контейнер стоит более ста тысяч рублей.

БЕЛОРУСАМ НАДО ЕСТЬ ХРИЗАНТЕМЫ

Каждой осенью, подводя итоги сезона, дачник с грустью задумывается, а зачем все это нужно — ежедневно ездить в город и обратно, стараться вырастить то, что на оптовом рынке стоит совсем мало, урабатываться до постоянной боли в спине и руках. И решает: все, весной найму какого-нибудь мужика, пусть участок перекопает, разровняет, и посею газон. Такое состояние продолжается месяца 2–3. А потом настоящий дачник начинает подсчитывать и прикидывать, сколько метров пленки купить и какой, не должна же пропадать замечательная теплица, какие семена приобрести и сколько. Но, самое главное, он хочет превратить дачную садово-огородную жизнь в интересное, замечательное и успешное времяпрепровождение. А для этого нужны очень разумные подходы к выращиванию растений. И не только капризных помидоров, перца и огурцов.

Западные дачники очень любят выращивать зеленые культуры. Они не такие теплолюбивые, как перец и помидоры, не требуют больших затрат.

Всего через 30–40 дней можно собирать урожай, в котором содержатся ценные питательные вещества. В семенах укропа, фенхеля, петрушки, кориандра, сельдерея, пастернака есть много эфирных масел. Оптимальные сроки их посева — середина марта, начало апреля и поздняя осень. Укроп — холодостойкая культура, он не боится заморозков до минус 8 градусов.

Белорусским дачникам стоит культивировать съедобную, или овощную, хризантему. К тому же японские ученые обнаружили, что это растение способно выводить из организма радионуклиды.

Хризантема имеет сильный запах и пикантный вкус. У растения съедобными считаются молодые листья и цветки. Их едят сырыми или отваривают, а цветами, кроме того, украшают различные блюда.

Хризантема — культура нетребовательная. Вкусной и сочной она остается до глубокой осени. Недаром в Китае ее называют "утинцай" — бесконечное растение. У нас тоже продаются семена хризантемы съедобной российской селекции. ■

ПРАВОВАЯ ПОМОЩЬ

с Олегом Волчеком

Подборка вопросов и ответов получена из архива общественного объединения «Правовая помощь населению», а также писем, приходящих в редакцию газеты. Читатели также **могут посылать свои вопросы на пейджер юриста — абонент № 3349, тел. 233-00-00.**

— В результате залива квартиры ливневым дождем из-за крыши, которая требует ремонта, причинен значительный ущерб, однако ЖРЭО отказывается в полном объеме возместить ущерб.

МАРАЕВ И.В., ВИТЕБСК

— Согласно Жилищному кодексу, статья 50, наймодатель жилых помещений государственного жилищного фонда обязан:

— систематически производить осмотр жилых помещений и объектов благоустройства придомовых территорий;

— проверять техническое состояние инженерного оборудования, проводить его профилактическое обслуживание, за исключением санитарно-технического и иного оборудования, находящегося в квартирах;

— обеспечивать надлежащее содержание подъездов, других вспомогательных помещений жилых домов и придомовой территории;

— своевременно производить капитальный и текущий ремонт вспомогательных помещений, конструктивных элементов и инженерных систем жилых домов;

— производить в срок, установленный законодательством или договором найма жилого помещения, устранения неисправностей в квартирах за свой счет, если эти дефекты появились вследствие неисправности конструктивных элементов или инженерных систем жилого дома;

— возмещать гражданам и юридическим лицам независимо от форм собственности причиненный по его вине ущерб.

Согласно статье 933 Гражданского кодекса, вред, причиненный личности или имуществу гражданина, а также вред, причиненный имуществу юридического лица, подлежит возмещению в полном объеме лицом, причинившим вред. Решать вопрос о возмещении ущерба необходимо в судебном порядке путем предъявления судебного иска.

— Как правильно оформить сдачу квартиры? Могут ли наказать за неуплату налогов?

ПАРХОМЧИК Ж.В, МИНСК

— Наниматель государственной квартиры сдает жилое помещение в поднайм с согласия ЖЭС. Составляется договор поднайма, подписывается сторонами. Договор заверяется начальником ЖЭС. Член ЖСК заключает договор найма, на котором должна быть подпись председателя правления кооператива. Для собственника квартиры (квартира приватизирована) согласия ЖЭС, ЖСК не требуется. Имея 3 экземпляра договора, сдатчик должен обратиться в налоговую инспекцию, где составит декларацию о доходах и получит квитанцию для уплаты налогов. Один экземпляр договора остается в ГНИ, второй у сдатчика, третий у поднанимателя. Начальник ГНИ или его заместитель вправе наложить административное взыскание в виде штрафа от 2 до 10 минимальных заработных плат в соответствии со ст. 154-1 Кодекса об административных правонарушениях.

РЭГІЁНЫ

І бачыў Бог, ёсць музыка над намі

Людміла ПАШКОЎСКАЯ

Гэтыя словы Восіпа Мандэльштама напісаны ў вестыбюлі Музычнага вучылішча ў Маладзечна. Ён знаходзіцца непадалёк ад чыгуначнага вакзалу і прайсці да яго можна па прыгожай пешаходнай вуліцы, якая паварочвае да гмаху гатэля і Палаца культуры.

Музычнае вучылішча імя Міхала Клеафаса Агінскага ў Маладзечна ведаюць добра. Яно адно з найбольш значных установаў горада.

Перада мною — прыгожы светлы трохпавярховы будынак з фасадам, падобным на загнуты унутр паўкруг. Кідаюцца ў вочы вытанчаная каваная вывеска-ліхтар каля ўваходу і дошка, прысвечаная Агінскаму, зробленая знакамітым беларускім скульптарам Валер'янам Янушкевічам. Аналаг яе падараваны італьянскаму гораду Фларэнцыя, дзе кампазітар жыў і памёр у 1833 годзе.

Перад будынкам — яшчэ адзін твор Янушкевіча, які з'явіўся тут тры гады таму. Гэта бронзавы помнік Агінскаму на гранітнай калоне. Большасць са сваіх лепшых твораў Міхал Клеафас напісаў у радавым фальварку Залессе, што знаходзіцца непадалёк ад Маладзечна. Цікава, што грошы на помнік збіралі ўсе маладзечанцы, прыносілі літаральна па рублю, бо выдзеленых абласнымі ўладамі сродкаў не хапала для завяршэння работы. Таму ён вельмі любімы гараджанамі.

Будынак вучылішча здзіўляе не толькі звонку, але і знутры. У вучылішчы ёсць вялікая канцэртная зала з выдатнай акустыкай. Яна лічыцца адной з лепшых камерных залаў Беларусі. Яе спраектавалі з часткі памяшканняў двух паверхаў. За такі праект дырэктару Рыгору Сароку давялося пабарацца. Але вынік быў варты намаганняў. Сёння ў зале праводзяцца рэпетыцыі і канцэрты шматлікіх мастацкіх калектываў вучылішча, перад уваходам ў яе дзейнічае вялікая выставачная пляцоўка, загадвае якой мастак Генадзь Селядзец. Тут кожны месяц адбываюцца новыя выставы і вучняў дэкаратыўна-прыкладнога аддзялення вучылішча, і мастакоў з Маладзечна ды іншых гарадоў Беларусі. У двары створана унікальная канцэртная сцэна, падобна як у сярэднявечнай Еўропе.

Дырэктар маладзечанскага музычнага вучылішча Рыгор Сямёнавіч Сарока — апантаны сваёй справай чалавек, які заўжды з задавальненнем распавядае і паказвае гасцям сваю гаспадарку. Яму ёсць чым ганарыцца. Многае, што захапляе наведвальнікаў, створана яго намаганнямі.



Сам Сарока нарадзіўся ў вёсцы ў дваццаці кіламетрах ад Маладзечна, каля Залесся. Скончыў вучылішча, у якім зараз працуе, кансерваторыю ў Мінску. У вучылішчы працуе дырэктарам амаль дваццаць пяць гадоў. Любіць Маладзечна, лічыць яго каларытным заходнім горадам.

«Вучылішча знаходзіцца недалёка ад Мінска, і на пэўным этапе тут многія людзі працавалі часова. І для навучальнай установы гэта надавала вельмі многа праблемаў. Хутка мяняліся кіраўнікі, сыходзілі выкладчыкі. Да мяне ў вучылішчы змянілася шэсць дырэктараў. Гэта перашкаджала стабільнасці ў навучальным працэсе, — распавядае Рыгор Сямёнавіч. — Мне ўдалося сабраць тут без перабольшання цудоўны творчы педагагічны калектыў, што пацвярджаецца на конкурсах метадычных работ, дзе нашы выкладчыкі часта займаюць першыя месцы. У вучылішчы існуюць моцныя харавыя і вакальныя калектывы. Мы маем шэраг лаўрэатаў міжнародных конкурсаў сярод вакалістаў, піяністаў, гітарыстаў. Нашы выпускнікі працуюць ад дацкай Каралеўскай оперы да Марыінскага тэатру ў Пецярбурзе, спяваюць там вядучыя партыі, ад Новай оперы ў Маскве да Дзяржаўнага тэатра музычнай камедыі ў Мінску».

У вучылішчы працуюць духавы, цымбальны калектывы, камерны аркестр рускіх народных інструментаў, які Рыгор Сарока ўзначальваў 19 гадоў, а цяпер ім кіруе Тамара Бялькова. Гэты калектыў першым пачаў выязджаць з вучылішча за мяжу. Амаль адначасова ў 1979 годзе ён узначаліў Сімфанічны аркестр вучылішча, у складзе якога сёння 70 выкладчыкаў і лепшых студэнтаў.

Такі аркестр — адзіны сярод усіх сярэдніх музычных установаў Беларусі. Сімфанічны аркестр маладзечанскага музычнага вучылішча часта выступае ў Беларускай дзяржаўнай філармоніі, выязджае ў Чэхію, Нямеччыну, Польшчу, Галандыю, Францыю на фестывалі, канцэрты. Два гады таму аркестр працаваў з вядучымі салістамі мюнхенскага опернага тэатра, з нямецкімі харавымі калектывамі.

За апошні год сімфанічны аркестр музычнага вучылішча ў Палацы культуры Маладзечна зрабіў 10 канцэртаў. Цікава, што вучылішча спрацавала ў маладзечанскім рэгіёне не толькі як установа, якая рыхтуе кадры для музычных школаў. Яно выконвала і выконвае сёння ролю філармоніі ў гэтым рэгіёне. На канцэрты-лекцыі калектываў вучылішча прыязджаюць школьнікі з Валожына, Вілейкі, Смаргоні. За некалькі дзесяткаў гадоў гэтыя калектывы выхавалі ў Маладзечна слухача з густам і цікавасцю да сапраўднага высокага, класічнага і народнага мастацтва. Цікава, што ўсе канцэрты ў Палацы культуры Маладзечна платныя, а кошты білетаў 5–7 тысяч, не так ужо мала па сённяшнім часе. Але залы заўжды поўныя. Маладзечанская публіка вельмі патрабавальная да ўзроўню выканання.

«Нядаўна адбыўся канцэрт Мінскай вобласці на конкурсе метадычных і творчых работ. У журы, якое ўзначальваў рэктар Беларускага інстытута праблем культуры прафесар Уладзімір Скарахадаў, адзначылі, што гэта быў лепшы канцэрт з тых, што яны наведалі. Нам было вельмі прыемна».

Ёсць у вучылішчы яшчэ адна адметнасць. Разам з музычным аддзяленнем у будынку працуе аддзяленне дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Ідэя паяднаць разам два віды мастацтва таксама належала дырэктару Рыгору Сароку. Яна грунтавалася на тым, што гістарычна ў Маладзечна была вялікая і цікавая групоўка мастакоў. У горадзе працуе мастацкая школа. Мінаблвыканкам і яго старшыня Мікалай Дамашкевіч ідэю Сарокі падтрымалі. І з 1995 года працуе на першым паверсе аддзяленне дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Выкладаюць на ім Вікторыя Чарвонцава і яе дзве дачкі Наталля і Елізавета. Усе тры жанчыны — прызнаныя народныя майстрыхі, сябры Саюза народных майстроў Беларусі.

На аддзяленні апошнія гады заўжды вялікі ўступны конкурс і звычайна высокі прахадны бал. Сюды паступаюць пасля мастацкіх спецыялізаваных школак, і нават тыя, хто не прайшоў па конкурсу ў Мінскае мастацкае вучылішча імя Глебава. Ёсць частка навучэнцаў, якія мэтава дасылаюцца сельскімі саветамі.

На аддзяленні вывучаюць саломапляценне, разьбу па дрэву, апрацоўку льнавалакну. Але найбольш — такі від народнай творчасці, як выцінанку. З паперы выразаецца нажніцамі складны малюнак. У старыя часы жанчыны на шкле малявалі кветкі, а пасля на іх наклейвалі бліскучыя лісты фальгі і такім чынам упрыгожвалі сцены і вокны. Ажурныя кампазіцыі дазваляюць рабіць самыя розныя сюжэты: ад простых птушачак і дрэўцаў да казачных сюжэтаў. Студэнты дасканала вывучаюць этнаграфію, народны касцюм і вышыўку, яны ствараюць ілюстрацыі да беларускага фальклору, міфалогіі.

Наталля Чарвонцава вядзе мяне ў музей вучылішча імя Юрыя Герасіменкі, таленавітага маладзечанскага мастака, які заўчасна пайшоў з жыцця. Тут захоўваюцца лепшыя дыпломы усіх выпускаў. Глядзіш на такое багацце твораў мастацтва, і разбягаюцца вочы. Тут ёсць саламяныя конікі, драконы, кветкі; дэкаратыўныя, народныя, іканапісныя кампазіцыі з саломкі на аксаміце; вялікія выцінанкі, маляваныя дываны, драўляныя скульптуркі. Непадалёк ад уваходу стаіць стол, верх якога зроблены з празрыстага шкла, а ножкі з саламяных плеценых кветак. Пасярэдзіне пакоя прытуліліся вялікая батлейка з папяровымі лялькамі і анёльчыкамі. Драўляны напольны гадзіннік — дыпломная праца аднаго са студэнтаў, а вось інкрустацыю саломкай зрабіла дзяўчына, якая заклала ў колах і квадратах сімволіку часу, жыцця і смерці. Дарэчы, вялікія дубовыя ўваходныя дзверы ў вучылішча — таксама дыпломная работа.

Выкладчыкі аддзялення часта наладжваюць выставы ў Маладзечна і Мінску. Зусім нядаўна ў абласной бібліятэцы імя Пушкіна ў Мінску адбылася выстава выцінанак дэкаратыўна-прыкладнога аддзялення маладзечанскага музычнага вучылішча.

Дырэктару Рыгору Сароку ўдалося зрабіць і цудоўную матэрыяльную базу для сваіх навучэнцаў. Ёсць станкі, прыстасаваныя класы, закупляецца папера і іншыя матэрыялы. Толькі саломку даводзіцца студэнтам нарыхтоўваць на кагласных палях самастойна, бо зямельнага надзелу для яе вырошчвання вучылішча не мае.

Купляюцца і дарагія замежныя музычныя інструменты. Як лічыць дырэктар, сур'ёзныя музыканты павінны іграць не на дровах. Усяго ў вучылішчы ёсць сёння 32 раялі, 300 піянінаў. У кожным пакоі студэнцкага інтэрната абавязкова стаіць гэты музычны інструмент. ■

БАЦЬКОЎСКІ РОЗДУМ

РЭФОРМА ШКОЛЫ ЦІ ДЗЯРЖАЎНЫ ІНТАРЭС

АНДРЭЙ ЦЕРАШКОЎ

Наша школьная рэформа пачалася яшчэ ў часы існавання СССР і працягваецца дагэтуль. Сусветны досвед дае шырокі выбар метадаў для пераадолення гэтых праблемаў — аналізуй і ўжывай. Але, падобна, з усяго, што выпрацавана чалавецтвам, у нас уявілі хіба дзесяцібальную сістэму ацэнкі і тэсты замест іспытаў. І нічога больш.

Па словах педагогаў, найлепшая школьная рэформа — класы па пятнаццаць чалавек. Гэта дазволіла б персаналізаваць вучэбны працэс, надаць кожнаму вучню дастаткова ўвагі, каб ён засвоіў неабходны аб'ём ведаў. Мусіць, у гэтым кірунку і павінна рухацца рэформа адукацыі, тым больш што гэта адпавядае і досведу краінаў Еўропы.

Апроч таго, і дэмаграфічная сітуацыя спрыяе ўкараненню гэтага прынцыпу: не сакрэт, што дзяцей у беларускіх сем'ях становіцца ўсё менш. Другім пунктам школьнай рэформы мусіць стаць падвышэнне адукаванасці вучняў у галіне інфармацыйных тэхналогіяў, бо без гэтага наша краіна ва ўмовах інфармацыйнага грамадства будзе сусветным аўтсайдэрам.

Трэцяе: ва ўмовах сусветных інтэграцыйных працэсаў рэзка ўзрастае значэнне міжнародных стасункаў. Гэта значыцца, што чалавек XXI стагоддзя мусіць валодаць не толькі роднай, але і некалькімі (а не адной!) замежнымі мовамі.

У нас жа вялікія праблемы нават з дзяржаўнай мовай, чаму выдатны прыклад некаторыя шыльды ў сталіцы: *«Ламбардъ»*, *«Кунцаўшчына»*. Пасля гэтага можна не згадваць такія ўзоры пісьмовай творчасці грамадзян, як рапарты, тлумачальныя лісты, заявы і гэтак далей.

Натуральна, для таго, каб праводзіць усе гэтыя захады ў жыццё, праца настаўніка павінна быць аўтарытэтнай і высокааплатнай. Нагрузка на яго мусіць быць зменшаная, а вызвалены час ён павінны траціць на самаадукацыю і падрыхтоўку ўрокаў па прадмеце. Як ні мяркуй, але для таго, каб падвысіць якасць адукацыі, трэба значна павялічыць выдаткі на школу і колькасць школьнага персаналу.

Гэта лагічныя развагі нармальнага чалавека, які заклапочаны паляпшэннем сістэмы адукацыі. Гэта развагі бацькі, для якога важны ўзровень ведаў ягонага дзіцяці, ступень яго падрыхтаванасці да выклікаў часу. Мяркую, да гэтых словаў далучыцца кожны. Словам, рэформа нам патрэбная.

Што ж прапануе нам дзяржава ў якасці далейшых крокаў? А вось што.

Мусяць быць зліквідаваныя класы з колькасцю вучняў менш за 25 чалавек. Яны будуць расфармоўвацца і ўзбуйняцца. Напрыклад, з трох класаў па 24 чалавекі будзе створана два класы па 36 чалавек. Калі гэта немагчыма ў межах адной школы, то частку дзяцей пераведуць у іншую школу ў межах мікрараёну. Зразумела, што настаўнік зможа выдзеліць кожнаму вучню ў сярэднім адну хвіліну за ўрок. Пра якасць ведаў тут казаць не даводзіцца.

Апроч таго, ствараецца механізм канчатковай ліквідацыі беларускіх класаў. Дзякуючы намаганням улады, сістэма нацыянальнай адукацыі і так практычна вынішчаная. З-за немагчымасці працягнуць адукацыю ў ВНУ на роднай мове, большасць бацькоў выбірае для сваіх дзяцей рускую мову навучэння. Такім чынам у галовы людзей убіваецца думка пра бесперспектыўнасць беларускай мовы.

Толькі прынцыповасць нацыянальна арыентаванай часткі грамадства не дазволіла дагэтуль зліквідаваць рэшткі беларускай адукацыі. А ў нас беларускія класы, як правіла, невялікія. Таму пад нож яны пойдуць першымі.

Другая ініцыятыва міністэрства адукацыі: скасаваць дысцыпліны «Беларуская літаратура» і «*Русская литература*». Яны будуць аб'ядланыя ў адным прадмеце, на вывучэнне якога вылучана тры гадзіны на тыдзень. Такім чынам замест двух настаўнікаў па беларускай і рускай літаратурах дастаткова аднаго. Улічваючы, што сёння людзі ўвогуле чытаюць значна менш, чым раней, рэалізацыя падобнай ідэі станецца сямімільным крокам да краіны ўсеагульнай непісьменнасці.

Узбуйнілі класы — колькасць настаўнікаў таксама скарачаецца. Нагрузка расце — дык не бярыце звыш нормы! Праца настаўніка — не за станком, яна патрабуе значнага часу на падрыхтоўку заняткаў. Таму норма — 18 гадзін у тыдзень (3 гадзіны на дзень). Праўда, плоцяць за гэта каля 126 тысячаў рублёў у месяц. Паспрабуйце пражыць. Таму бяруць больш — да 30 гадзін.

Ёсць яшчэ варыянт — класнае кіраўніцтва. Гэта дазваляе зарабіць дадаткова каля 40 тысяч рублёў. Небагата. Але чаго гэта каштуе! Пазакласная нагрузка складае да 8 гадзін у тыдзень (пры гэтым вучэбную ніхто не здымае). Абавязкова трэба сярод тыдня выкраіць час, каб правесці заняткі па правілах дарожнага руху, пажарнай бяспецы ці аб шкодзе палення, звадзіць дзяцей у тэатр ці музей, а то і ў паход.

Апроч таго, трэба наведваць сем'і цяжкіх падлеткаў і праводзіць выхаваўчую працу. Збор сродкаў з бацькоў на рамонт класаў, арганізацыя гэтага рамонту таксама задача класнага кіраўніка. Калі рыхтаваць урокі, калі правяраць сшыткі, калі займацца самаадукацыяй? І самае галоўнае: якой якасці веды атрымаюць пры гэтым дзеці?

Людзі ведаюць кошт гэтых ведаў. Усеагульны бацькоўскі смех выклікала заява аднаго з дзяржаўных дзеячоў: «*Увядзенне тэстаў прывядзе да знікнення інстытуту рэпетытарства*». Дзякуючы тэставанню, рэпетытары атрымалі ў гэтым годзе, бадай, найвышэйшыя даходы. Мы, бацькі, плоцім двойчы. Спачатку падаткі, якіх цалкам дастаткова для забеспячэння нармальнай адукацыі для нашых дзяцей. Потым аддаем за рэпетытарства тыя грошы, якія дзяржава недаплаціла настаўнікам за іх працу.

Школа сталася чарговым баранам, прынесеным у ахвяру ў імя захавання лукашэнкаўскай улады, на сумленні якой развал гаспадаркі, гвалт з канстытуцыяй, разлад з суседзямі, шматлікія парушэнні правоў чалавека. Гэтай уладзе не патрэбныя адукаваныя асобы — цёмнымі масамі лягчэй кіраваць. Не патрэбныя ёй людзі, выхаваныя на высокіх маральных каштоўнасцях, бо іх не сагнуць.

Нашай уладзе патрэбны статак маўклівых баранаў, без усялякіх перакананняў і прынцыпаў, з якіх можна стрыгчы поўсць бясконца і ад якіх магчыма пачуць адзінае: «*Б-э-э, одобрям!*»

Менавіта таму замест удасканалення вучэбнага працэсу спускаюцца загады па стварэнні ў школах структураў БРСМ і піянераў. Менавіта таму замест паляпшэння ўмоваў працы настаўнікаў уводзяцца штатныя адзінкі намеснікаў па ідэалогіі. У выніку дзяржаўнай рэформы школа становіцца чарговым звяном уладнай сістэмы прамывання мазгоў разам з дзяржаўнымі тэлебачаннем і прэсай. ■

ДАВЕДКА

Тарыфная стаўка настаўніка (18 гадзін у тыдзень) — **125 628** рублёў у месяц.
Настаўнік, які мае найвышэйшую катэгорыю і стаж, вышэйшыя за 15 гадоў, атрымлівае за 18 гадзін у тыдзень **163 316** рублёў у месяц.
Праверка сшыткаў пасля аднаго ўроку (36 вучняў) — **135** рублёў
Класнае кіраўніцтва за 4,5 гадзіны ў тыдзень — **37 606** рублёў у месяц.

СПОРТОБЗОР

с Сергеем Витальевым

■ Новое имя

Список обладателей Кубка Беларуси расширился. Очередным клубом, сумевшим завоевать этот почетный трофей, стал солигорский «Шахтер». Это не только первый значимый успех горняков, но и первое серьезное достижение на тренерском посту Юрия Вергейчика. Эта победа и команде, и тренеру была необходима как никогда. Ведь «Шахтер», относящийся в последнее время к лидерам нашего футбола, каждый год ставит перед собой задачи попасть как минимум на пьедестал и в еврокубки. И каждый год чуть-чуть не хватает. Точнее, не хватало.

Перед финальным поединком отдать предпочтение кому-либо из соперников было сложно. Отнюдь не чемпионскую игру демонстрирует «Гомель», а «Шахтер» поразила болезнь редкого миролюбия. Согласитесь, выделить в таких условиях фаворита было сложно. Однако формат розыгрыша кубка не оставлял путей к отступлению. Кто-то обязательно должен был выиграть, а кто-то проиграть.

В итоге победу праздновали горняки. Игра отнюдь не изобиловала голевыми моментами и зрелищностью, чем-то напоминая перетягивание каната с обоюдными шансами на успех. И он пришел к «Шахтеру». Прежде всего, потому, что подопечные Вергейчика сумели прибавить и показать свою лучшую в этот день игру именно тогда, когда отступать было уже некогда. За восемь минут до истечения дополнительного времени они забили единственный победный гол. Остается пожелать «Шахтеру» успешно выступить в Кубке УЕФА и поправить свои дела в чемпионате, ведь команда доказала, что способна не только на ничьи.

■ Все-таки плывем

Чемпионат Европы по дзюдо в Бухаресте подвел черту под олимпийским отбором в этом виде спорта. И надо признать, что, несмотря на одну медаль (серебро завоевала Татьяна Москвина), первенство можно признать успешным. Москвина благодаря выходу в финал обеспечила себе участие в третьей в своей карьере Олимпиаде. Несмотря на пятое итоговое место, сумел набрать необходимые баллы для поездки в Афины и Сергей Новиков. Добавим сюда получивших лицензии ранее Кухаренко, Макарова, Ларюкова, Шундикова, Рыбака и получим весьма солидное представительство белорусов на Олимпиаде. Теперь главное, чтобы количество перешло в качество.

■ В Афины всемером

Мадридский «Реал» близок к тому, чтобы стать посмешищем для всей Европы, равно как и наглядным примером того, как не надо вести клубные дела. Клуб, еще полтора-два месяца назад претендовавший на звание сильнейшего в мире, проигрывает всем подряд и близок к тому, чтобы остаться без медалей национального первенства. Для этого требуется сущий пустяк — проигрыш в последнем туре вкупе с победой «Депортиво». Данный исход вполне реален. Ведь королевский клуб проиграл уже четыре поединка кряду (впервые за сто два года своей славной истории), уступив в последнем туре 1:2 даже «Мурсии», уверенно замыкающей турнирную таблицу с пятью победами за сезон (учитывая выигрыш у «Реала»). Интересно, станет ли это уроком для любителей коллекционировать звезд?

■ От великого до смешного

Мадридский «Реал» близок к тому, чтобы стать посмешищем для всей Европы, равно как и наглядным примером того, как не надо вести клубные дела. Клуб, еще полтора-два месяца назад претендовавший на звание сильнейшего в мире, проигрывает всем подряд и близок к тому, чтобы остаться без медалей национального первенства. Для этого требуется сущий пустяк — проигрыш в последнем туре вкупе с победой «Депортиво». Данный исход вполне реален. Ведь королевский клуб проиграл уже четыре поединка кряду (впервые за сто два года своей славной истории), уступив в последнем туре 1:2 даже «Мурсии», уверенно замыкающей турнирную таблицу с пятью победами за сезон (учитывая выигрыш у «Реала»). Интересно, станет ли это уроком для любителей коллекционировать звезд? ■

АНЕКДОТЫ

от редактора

— Какая разница между референдумом и плебисцитом?
— А никакой. В любом случае будет третий президентский срок.

* * *

— А что вся белорусская оппозиция состоит из помощников и друзей Лукашенко?
— Почему ты так думаешь?
— Потому что по телевизору полдня показывают президента и полдня оппозиционеров.

ПРЕСС-ПАПЬЕ

«Сегодня мы можем сказать, что без боеспособного кадрового корпуса нет политического лидерства как политического феномена»

Б. Лепешко, «Советская Белоруссия», 19.05.04

«Если вы беременны, то хоть и временно, находитесь под защитой Трудового кодекса РБ»

Ю. Большакова, «Рэспубліка», 19.05.04

«При встрече с шаровой молнией лучше отнестись к ней как к незнакомой собаке»

О. Усачев, «Наблюдатель», 18.05.04



«Щедрое солнце так распалило маховики пушки, что можно было обжечь руку»

капитан А. Соболевский, «Во славу Родины», 19.04.05

КРОССВОРД НЕ ТОЛЬКО ДЛЯ УМНЫХ ОТ АЛЕКСЕЯ МАКОВЦА, МИНСК



ПО ВЕРТИКАЛИ:

1. Развернутое высказывание одного лица. 2. Посвященный в тайны учения, ревностный приверженец. 3. Поклонник изящного, оценивающий все исключительно с эстетической точки зрения. 4. Публичное исполнение музыкальных произведений по заранее объявленной программе. 7. Античное сооружение для зрелищ: овальная арена, вокруг которой уступами располагались места для зрителей. 8. Французский архитектор эпохи Возрождения, ввел «французскую колонну», богатый скульптурный декор. 9. Изба на Украине. 10. Государство, возглавляемое эмиром. 11. Расстройство речи при сохранности органов речи и слуха, обусловленное поражением коры больших полушарий головного мозга. 15. Общее название древних и средневековых многострунных щипковых музыкальных инструментов. 17. Человек, мыслящий прагматически. 19. Военачальник у славян. 21. Отец всех турок Мустафа. 22. Большой метеор исключительной яркости. 23. Гипотетические фундаментальные частицы, из которых состоят все адроны. 26. Выборный председатель исполнительного органа. 28. Политическая организация, выражающая интересы социальных групп, объединяющая их наиболее активных представителей. 29. Главный говорун в парламенте. 30. Род преимущественно древесных растений семейства бобовых, к которым принадлежит мимоза. 31. Одно из основных понятий этики стоицизма, полная свобода души от страстей и аффектов. 33. Вывоз товаров или капиталов за границу. 34. Низкомолекулярное органическое соединение, необходимое в незначительных количествах для нормального обмена веществ и жизнедеятельности живых организмов. 38. Оглобля между двумя запряженными лошадьми. 39. Звание унтер-офицера из дворян в российской армии.

ПО ГОРИЗОНТАЛИ:

5. Страна — цель экспедиции аргонавтов. 6. Древнеримский заседатель, должностное лицо, облеченное судебной властью. 8. Две картины, связанные единым замыслом. 10. Хроническое незаразное заболевание кожи, возникающее при нарушении обмена веществ. 12. Специально спрофилированный закрытый канал для разгона жидкости или газа, придания потоку заданного направления. 13. Постановление, принятое собранием плебеев. 14. Легкое женское покрывало у ортодоксальных мусульман, закрывающее фигуру с головы до ног, надеваемое при выходе из дома. 16. Высшая административная должность в городах фашистской Италии с 1926 года. 18. Река, на которой стоит столица россиян. 20. Название Крымского полуострова, распространенное со средних веков. 22. Индонезийская техника росписи ткани при помощи воска, а также сама многоцветная ткань. 24. Массовое празднество, смотр и показ достижений какого-нибудь искусства. 25. Сценическое искусство, в котором художественный образ творится пластикой, мимикой и жестом. 27. Английский физик, заложивший основы квантовой электродинамики и квантовой теории гравитации. Нобелевский лауреат 1933 года на пару с Э. Шредингером. 28. Почетный титул главнейших епископов в католической и англиканской церквах. 30. Саранча. 32. Писатель, изъясняющийся исключительно прозой. 35. Короткая комедийная пьеса для двух-трех исполнителей, ведущая начало от народной интермедии. 36. Обитатели Эквадора. 37. Исповедующий идеи стоицизма. 40. Солдат турецкой регулярной пехоты, укомплектованной путем насильственного набора мальчиков из христианского населения Османской империи. 41. Страна восходящего солнца. 42. Вид лица сбоку. 43. Изображение, где относительное распределение яркостей различных участков обратно их распределению в объекте съемки.

АНОНС

КОНЦЕРТЫ

31 мая. Концертный зал «Минск». КВН. «Незолотая молодежь» и сборная команда КВН. Начало в 19.00. Билеты от 15 до 35 тысяч.

2–3 июня. Концертный зал «Минск». Концерт Геннадия Хазанова. Начало в 19.00. Билеты от 20 до 90 тысяч.

Салон связи «Мегаплюс» представляет. **3 июня** в клубе «Реактор» концерт-презентация альбома «Золотые яйцы» «Ляписа Трубецкого». Начало в 20.00. Билеты от 15 до 22 тысяч.

5 июня. Дворец спорта. Концерт группы *DDT*. Начало в 19.00. Билеты от 25 до 60 тысяч.

10 июня. Дворец республики. Концерт Александра Серова «Моя богиня». Начало в 19.00. Билеты от 20 до 100 тысяч.

ТЕАТР

26 и 27 мая. Театр киноактера. Правдивая сказка для взрослых «Остров нашей любви и надежды». Начало в 19.00. Билеты до 5 тысяч.

27 мая. Национальный академический театр им. Янки Купалы. Моноспектакль в одном действии «Беларусь в фантастических рассказах». Начало в 19.00. Билеты до 4 тысяч.

28 мая. Театр киноактера. Трагикомедия в одном действии «Милый лжец». Начало в 19.00. Билеты до 5 тысяч.

28 мая. Молодежный театр. Премьера комедии Коки Митани «Академия смеха». Начало в 19.00. Билеты от 800 до 2 тысяч.

29 и 30 мая. Театр киноактера. «Заноза» Франсуазы Саган. Начало в 19.00. Билеты до 5 тысяч.

ВЫСТАВКИ

11 мая — 4 июня. Музей современного изобразительного искусства, пр-т Скорины, 47. Фотографии чрезвычайного и полномочного посла КНР Юй Чжэньци «Любимая Беларусь и зарубежье в фокусе». Билеты до 2 тысяч.

ПОГОДА 22–28 МАЯ

В целом по Беларуси	Осадки	День	Ночь	Вероятность осадков, %
Суббота, 22 мая	Дождь	15	3	70
Воскресенье, 23 мая	Переменная облачность	14	3	30
Понедельник, 24 мая	Облачно	15	3	50
Вторник, 25 мая	Дождь	16	4	60
Среда, 26 мая	Дождь	14	6	60
Четверг, 27 мая	Переменная облачность	17	7	30
Пятница, 28 мая	Переменная облачность	20	8	10

ОТВЕТЫ НА КРОССВОРД В № 15 ОТ 15.05.04

По вертикали: 1. Марля. 2. Администрация. 3. Катод. 4. Горчица. 6. Дисконт. 7. Анонимка. 8. Демокрит. 9. Прототип. 10. Китоврас. 16. Пони. 17. Лорд. 18. Монсеньор. 21. Буффонада. 23. Зарница. 24. Вестерн. 31. Лицензия. 32. Агон. 33. Митридат. 34. Электричество. 35. Механика. 36. Сион. 37. Лингвист. 42. Одиссей. 43. Мисюрка. 49. Нефть. 50. Барин.

По горизонтали: 5. Гладиатор. 11. Значение. 12. Редукция. 13. Денница. 14. Доброта. 15. Антоним. 19. Бобр. 20. Трон. 22. Барон. 25. Иудея. 26. Фаталист. 27. Подтекст. 28. Имбецильность. 29. Собственность. 30. Плацдарм. 35. Мистраль. 38. Койот. 39. Идиот. 40. Форт. 41. Хаос. 44. Торнадо. 45. Кистень. 46. Ригведа. 47. Биосфера. 48. Курфюрст. 51. Герострат.

ІНФАРМАЦЫЙНА-АНАЛІТЫЧНАЯ ГАЗЕТА «ЗГОДА»

Заснавальнік і галоўны рэдактар: АЛЯКСЕЙ КАРОЛЬ
Рэдактар: АЛЕСЬ СДВІЖКОЎ
Рэгістрацыйнае пасведчанне: нумар 582 ад 5 ліпеня 1995 года
Аб'ём: 4 умоўных друкаваных аркуша
Наклад: 4700 асобнікаў
Адрас рэдакцыі: г. Мінск, 220005, вул. Чырвоная, 16-12
Тэл./факс: 236-24-80
Падпісана да друку: 21.05.04
Заказ нумар: 420

Надрукавана з дыяпазітываў заказчыка ў тыпаграфіі «Плутас-маркет», г. Мінск, вул. Кульман, 1